# «РАЗВІЦЦЁ ГЛЫБОКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ Ў САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЕ ТАРМОЗІЦЦА АДСУТНАСЦЮ АГУЛЬНАЙ КАНСТЫТУЦЫІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Калі вы пазбавіцеся, даруйце мне, ад «сіндрому Лукашэнкі», мы штосьці зробім. Нікому не дадзена разбурыць святое — адзінства народаў, і калі хтосьці паспрабуе — будзе дрэнна», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён адзначыў: «Мы паводзім сябе як у адзінай дзяржаве, перажываючы за сябе і за вас».

Расійскія журналісты закранулі тэму маючых адбыцца ў будучым годзе прэзідэнцкіх выбараў у Расіі. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што не хацеў бы на гэту тэму разважаць.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Я ведаю аднаго і другога і ацэньваю іх аб'ектыўна. Мне здаецца, як бы ў Расіі ні абвастрылася сітуацыя, ніхто не стане адмаўляць, што ёсць магчымасць ім дамовіцца. Я прыхільнік гэтага — каб яны вызначыліся. Яны ад сябе не ініцыіруюць гэты працэс, каб грамадства цяпер пачало абмяркоўваць пытанне, а хто там, і гэтак далей. І на Захадзе, і ў Расіі, асабліва на Захадзе, і амерыканцы хацелі б ведаць ужо сёння — а як, хто? Я не хацеў бы на гэту тэму нават разважаць».

Кошт беларускай АЭС з улікам інфраструктуры складзе $9 млрд, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. «АЭС з інфраструктурай будзе каштаваць $9 млрд, у тым ліку каля $6 млрд будзе каштаваць сама станцыя і $3 млрд — інфраструктура».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў Беларусі назіраецца перакос сярод крыніц атрымання электраэнергіі ў бок прыроднага газу (з яго выпрацоўваецца больш за 80 працэнтаў усёй электраэнергіі краіны). «Вядома, настала пытанне дыверсіфікацыі крыніц атрымання электраэнергіі, і мы папрасілі расіян, перш за ўсё, каб яны пабудавалі нам АЭС. Важдаемся ўжо, мабыць, гады тры. Даўно трэба было прыняць рашэнне і пачаць будаўніцтва». Ён таксама дадаў, што свае прапановы аб будаўніцтве станцыі прысылалі і іншыя кампаніі, у тым ліку японскія, карэйскія, кітайскія. «Сёння ёсць і іншыя кампаніі, у прыватнасці, японскія, якія гатовы прыйсці сюды. Чаму мы з амерыканцамі вельмі супрацоўнічалі апошнія паўгода? Мы хацелі падтрымкі амерыканцаў у тым плане, каб яны дазволілі японцам прыняць удзел у конкурсе на будаўніцтва АЭС, паколькі на японскіх АЭС прымяняюцца ў асноўным амерыканскія тэхналогіі. Амерыканскі бок дазволіў японцам удзельнічаць у гэтым конкурсе. Карэйцы таксама адказалі, кітайцы прыслалі прапановы, але іх варыянт прадугледжваў больш нізкі ўзровень бяспекі».

Беларусь спынілася на расійскім варыянце будаўніцтва АЭС. У час праведзенага 15 сакавіка пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы пагадненне аб будаўніцтве АЭС паміж Беларуссю і Расіяй было падпісана, нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі праходзіць апошні этап падрыхтоўкі да запуску, — заявіў Прэзідэнт Беларусі. «Мы зрабілі новы, сучасны спадарожнік. Асноўныя дэталі, элементы, у тым ліку оптыка, — беларускія», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама паведаміў, што ў Беларусі створаны свой ЦКП, усе беларускія касмічныя сістэмы адаптаваны да расійскіх элементаў і яны будуць працаваць як адзінае цэлае. «Ужо ідуць апошнія падрыхтоўкі да пуску. Праз некалькі месяцаў беларускі спадарожнік будзе запушчаны».

Прэзідэнт Беларусі таксама паведаміў, што Беларусь актыўна працуе над развіццём тэхналогій у касмічнай сферы. Так, беларускія элементы выкарыстоўваюцца ў расійскіх спадарожніках, рэспубліка выпрацоўвае дэталі і для касмічнай тэхнікі Кітая.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і кіраўнік урада Расіі Уладзімір Пуцін ніколі ворагамі не былі, — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Мы з Уладзімірам Пуціным ніколі ворагамі не былі. Ён там штосьці сказаў, я там штосьці сказаў. Мы размаўлялі з ім нармальна, абмяркоўваючы ўсе праблемы». «А апошняе пасяджэнне Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы — гэта прарыў у нашых адносінах. Мы падпісалі пагадненне, якое тры гады не маглі выпрацаваць, па АЭС, дамовіліся па іншых пытаннях. Нявырашаных пытанняў у нас не засталося». Ён таксама дадаў: «Я лічу, у час майго маючага адбыцца візіту ў Маскву мы з Прэзідэнтам Расіі ўсе палітычныя, ваенна-палітычныя пытанні вырашым. І гэта не таму, што Лукашэнку на Захадзе, бачыце, не прымаюць, і таму ён зноў перакінуўся да Расіі. Я Уладзіміру Уладзіміравічу адразу сказаў: калі вы думаеце, што мы не будзем выбудоўваць адносіны з Захадам, то памыляецеся. Мы будзем з імі выбудоўваць нармальныя адносіны».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што Беларусь, знаходзячыся паміж Расіяй і ЕС, апынулася нібы паміж молатам і кавадлам. «І тыя нас душаць, і гэтыя нас ціснуць. Яно і зразумела — наш лёс такі. Мы на скрыжаванні, у нас геаграфічны цэнтр Еўропы. Але мы не хочам быць нейкай раздзяляльнай паласой, мы хочам, каб да нас нармальна адносіліся». Закранаючы адносіны з Захадам, Аляксандр Лукашэнка дадаў: «Мы будзем гэтыя адносіны выбудоўваць, не паварочваючы ні на захад, ні на поўнач, ні на поўдзень, ні на ўсход».

Дзяржава гатова прадаць свой пакет акцый у МТС за $1 млрд. Расійская кампанія, якой у СТАА «МТС» належыць 49 працэнтаў акцый, выказала жаданне набыць кантрольны пакет дзяржавы. «Мы не супраць, адзін мільярд на стол. Ацэнка праведзена. Хочаш купляць — калі ласка, не хочаш — выставім на аўкцыён».

Выбраны Беларуссю шлях правільны, але слаба абаронены, адзначыў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт адзначыў, што беларускі шлях слаба абаронены, перш за ўсё з-за эканамічных прычын: «Гэты беларускі шлях сёння нікому ў свеце не патрэбны. Гэта «дрэнны» прыклад для тых, хто будуе сваю эканоміку інакш — на прынцыпах «дзікага капіталізму». «Мы часам як белыя вароны выглядаем. Але мы спакойна робім сваю справу, рухаемся наперад».

Пры гэтым ён падкрэсліў важнасць таго, каб за межамі Беларусі атрымлівалі аб'ектыўную інфармацыю аб працэсах, якія адбываюцца ў краіне, аб яе рэчаіснасці.

«Славянскаму базару» ў Віцебску быць і развівацца, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ён штогод прыязджае на адкрыццё гэтага фестывалю, тым самым дэманструючы: «Славянскаму базару» быць. «Мы будзем яго праводзіць, нават калі расіяне з украінцамі сюды не прыедуць. Гэта наш галоўны фестываль», — сказаў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да расійскіх журналістаў, Аляксандр Лукашэнка папрасіў іх унесці сваю лепту ў папулярызацыю гэтага міжнароднага праекта. «Давайце па-сапраўднаму пакажам на ТБ Беларусі, Расіі і Украіны «Славянскі базар», і тады яшчэ больш людзей сюды прыедуць. Многія імкнуцца паглядзець і паслухаць зорак, але хацелася б, каб ехалі на адкрыццё новых маладых выканаўцаў. Хачу, каб і новыя таленты з'яўляліся на сцэне праз наш фестываль», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У Беларусі і ў далейшым будзе ўдзяляцца належная ўвага ўвекавечанню гераічнага мінулага народа, адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў Мінску плануюць пабудаваць новы будынак Музея Вялікай Айчыннай вайны, каб захаваць дакументы і сведчанні гэтага гістарычнага перыяду з улікам сучасных патрабаванняў. Будучыя пакаленні павінны памятаць пра тых, хто заваяваў свабоду і незалежнасць.

Расійскія журналісты сказалі аб тым, што Беларусь — гэта адзіная дзяржава, якая ажыццявіла праект па выпуску шматтомнага выдання «Памяць». «У гэтых кнігах — асоба народа-пераможца ў Вялікай Айчыннай вайне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён расказаў, што ў Беларусі на дзяржаўным узроўні і ў далейшым будзе ўдзяляцца вялікая ўвага ветэранам вайны.

Беларусь субсідзіруе кожнага расіяніна, прадаючы ім прадукцыю па нізкіх цэнах, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што старшыня ўрада Расіі Уладзімір Пуцін часта гаворыць аб тым, што Расія субсідзіруе ўбеларускую эканоміку, прадаючы краіне бяспошлінную нафту. «Калі вам АЭП і Мытны саюз на шкоду — не рабіце гэтага. Так, бяспошлінная нафта — гэта карысць для нас. Але ён (Уладзімір Пуцін. — Заўвага БЕЛТА) гаворыць адно і не гаворыць другога, што мы субсідзіруем кожнага расіяніна, прадаючы прадукцыю, не толькі сельскай гаспадаркі, за паўцаны ў Расію. А гэта $30 млрд. Гэта не $2 млрд і не $4 млрд», — сказаў Прэзідэнт.

## «Online-марафон» ПЕНСІІ, БЯСПЕКА ПРАЦЫ, САЦПАДТРЫМКА

**Бліжэйшым часам Міністэрства працы і сацыяльнай абароны наладзіць чарговы «online-марафон», удзел у якім могуць узяць усе жыхары нашай краіны.**

Як паведаміла **прэс-сакратар міністэрства Варвара АЛЕКСАНДРОВІЧ**, у рамках «online-марафона» запланавана правядзенне інтэрактыўных канферэнцый. **22 сакавіка,** — падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, стажыроўцы, павышэнню кваліфікацыі і праверцы ведаў работнікаў па ахове працы, а **29 сакавіка,** — пытанням сацыяльнай абароны пажылых людзей, ветэранаў і інвалідаў. Прычым у гэтыя дні ўсе тры канферэнцыі пройдуць у аднолькавы час — **з 11.00 да 12.30.** Дарэчы, нагадала Варвара Александровіч, задаць сваё пытанне спецыялістам міністэрства зможа кожны. Непасрэдна ў дзень і час правядзення канферэнцый зрабіць гэта магчыма праз сайт **www.mintrud.gov.by (раздзел «Інтэрактыўныя канферэнцыі»)**, а напярэдадні — праз e-mail: **press@mintrud.gov.by** або па **факсе (8-017) 306-38-84 (з адзнакай «online-марафон»)**.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Абзац

◢ **Сёння спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння Генадзя Кісялёва — беларускага гісторыка, літаратуразнаўцы, пісьменніка, археолага, доктара філалагічных навук. Аўтар прац па гісторыі беларускай культуры, праблемах аўтарства паэм «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Лаўрэат Дзяржпрэміі Беларусі. Памёр у 2008 г.**

◢ Пенсію за асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь атрымлівае 4,9 тыс. чалавек, паведаміла падчас online-канферэнцыі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны краіны Валянціна Каралёва. Сярэдні памер гэтай пенсіі складае Br889 тыс. 359 (сярэдні памер пенсіі па ўзросце — Br612 тыс. 717).

◢ **Першыя белыя буслы вярнуліся ў Беларусь пасля зімоўкі ў цёплых краінах. Па звестках ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны», іх заўважылі ў Жодзіне. Арнітолагі чакаюць, што ў самы бліжэйшы час з выраю вернуцца палявыя жаўрукі, кнігаўкі, шпакі. За імі пацягнуцца гусі, берасцянкі і сітаўкі.**

◢ Беларускія пaмежнікі дапамаглі выратаваць літоўскага рыбака. Нарад памежнага паста «Беркшты» заўважыў, як удалечыні, на літоўскай частцы возера Кабеляй пад лёд праваліўся рыбак. Інфармацыя была аператыўна перададзеная літоўскім калегам, якія літаральна праз некалькі хвілін выратавалі чалавека. У адрас гродзенскіх памежнікаў паступіла падзяка ад камандавання Варэнскага памежнага атрада (Літва).

◢ **У Салігорску 4-класнік стрэліў з пнеўматычнай вінтоўкі ў галаву хлопчыка. Міліцыянеры ўстанавілі, што 4-класнік стрэліў у галаву свайго равесніка. Пацярпелы з адкрытай ЧМТ і пашкоджаннем галаўнога мозгу шпіталізаваны ў Салігорскую ЦРБ. Праводзіцца праверка.**

## Поўны абзац

◢ Жыхар Гродна спрабаваў схаваць наркотыкі ў роце. У пункце пропуску «Брузгі» пры праверцы атрыманай аператыўнай інфармацыі гродзенскімі памежнікамі быў спынены 24-гадовы жыхар абласнога цэнтра, які ўязджаў у Беларусь. Пры аглядзе яго аўто з дапамогай службовага сабакі наркотыкі знайсці не ўдалося. Як выявілася, ён рыхтаваўся да агляду, змясціў марыхуану ў цэлафанавы прадаўгаваты цыліндр і схаваў у сябе ў роце. Пачаўшы апытанне, аператыўнікі адразу зразумелі, што да чаго. Раслліннае рэчыва канфіскавалі, парушальніка затрымалі.

◢ **Жыхар штата Ілінойс (ЗША) выпадкова ўчыніў пажар у сваім доме, калі спрабаваў выкурыць вавёрак, што там пасяліліся. Сям'ю Роберта Х'юза вельмі раздражнялі вавёркі, якія скрабліся за сцяной — мяркуючы па ўсім, там пасялілася цэлая сям'я. Гаспадар у рэшце рэшт вырашыў выгнаць надакучлівых жывёлак з дапамогай дымавой шашкі. Ён паклаў шашку побач з адтулінай, праз якую вавёркі траплялі ў сваё жытло, і праз некалькі імгненняў не толькі паваліў густы дым, але і загарэлася. У хуткім часе па выкліку прыехалі пажарныя, ім давялося праламаць дах дома Х'юза, а таксама пашкодзіць сцяну суседняга, каб спыніць распаўсюджанне агню. Сума ўрону не паведамляецца, але яна значная. Роберт спадзяецца, што вавёркі ўсё ж выселяцца з яго дома, які напалову згарэў.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

| Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.03.2011 г. (для б/н разлікаў) | | | |
|---|---|---|---|
| ■ 1 долар ЗША | 3 020,00 | 1 чэшская крона | 173,88 |
| ▲ 1 еўра | 4 250,05 | 1 польскі злоты | 1044,89 |
| 1 латвійскі лат | 6 002,78 | ▲ 1 расійскі рубель | 106,05 |
| 1 літоўскі літ | 1 229,19 | 1 украінская грыўня | 379,54 |

| Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ | |
|---|---|
| USD | 28,4763 |
| 10 UAH | 35,7900 |
| 1000 BYR | 9,4261 |
| EUR | 40,0633 |

## СУСТРЭЧЫ З НАСЕЛЬНІЦТВАМ СТЫМУЛЮЮЦЬ АКТЫЎНАСЦЬ І ПАВЫШАЮЦЬ АДКАЗНАСЦЬ КІРАЎНІКОЎ НА МЕСЦАХ

**Такое меркаванне выказаў журналістам першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ, наведваючы Воранаўскі раён, перадае БЕЛТА.**

На дні інфармавання і любыя сустрэчы чыноўнікаў з працоўнымі калектывамі людзі заўсёды прыходзяць актыўна. Нават пры дастатковай колькасці інфармацыі ў інтэрнэце і газетах яны хочуць пачуць жывое слова, паразмаўляць, эмацыянальна адчуць, наколькі чыноўнік, дырэктар шчыра верыць у тое, што кажа. З іншага боку, такія сустрэчы стымулююць больш актыўную пазіцыю саміх кіраўнікоў, павышаюць іх пачуццё адказнасці, адзначыў Аляксандр Радзькоў.

Воранаўскі рэгіён вядомы сваімі поспехамі ў вырошчванні бульбы. Цяпер у раёне прадумваюць магчымасць не проста збыту клубняў, а стварэння перапрацоўчага прадпрыемства. Такія стратэгічныя пытанні, як і пытанні будаўніцтва дарог, станцый ачысткі вады ад прымесяў жалеза, павінны абмяркоўвацца з насельніцтвам. На думку першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, у прадстаўнікоў дзяржорганаў, якія выязджаюць на сустрэчы з грамадзянамі, ёсць адчуванне правільнасці гэтай работы, а ў людзей — цікавасць да праблем грамадства і разуменне сваёй ролі ў развіцці рэгіёну і краіны ў цэлым. Аляксандр Радзькоў сустрэўся з кіраўніцтвам райвыканкама, ідэалагічным актывам раёна, уручыў падзячныя лісты Прэзідэнта Беларусі членам ініцыятыўных груп. Ён таксама сустрэўся з працоўным калектывам установы «Рэдакцыя газеты «Воранаўская газета» і праграмы радыёвяшчання «Воранаўскі веснік», затым адбылася сустрэча з калектывам СВК «Гіркі» і жыхарамі сельскага Савета.

## НАЙБУЙНЕЙШАЯ ПАРТЫЯ МЕТАДОНУ БЫЛА ЗАТРЫМАНА Ў БЕЛАРУСІ

**На кватэры ў магілёўчаніна было знойдзена 4,5 кілаграма метадону на суму больш за 1,5 млн долараў. Супрацоўнікі ГУУС Мінгарвыканкама ўжо назвалі гэтую партыю сенсацыйным выпадкам для Беларусі.**



**У гэтай бутэльцы знаходзіцца 65 тыс. доз для наркаманаў, або больш за 1,5 млн долараў.**

Хімік па адукацыі, магілёўчанін К. пагадзіўся сінтэзаваць наркотык. У яго кватэры была знойдзена міні-лабараторыя для вырабу метадону, а таксама дзясяткі тысяч доз гатовага прадукту. Наркотык ён пастаўляў па 10 долараў за грам арганізатарам злачыннай групоўкі. А тыя ўжо перапрадавалі яго наркаманам па кошце ў 10-12 разоў вышэйшым.

Па меркаванні следства, арганізатараў было двое. Мужчына і 38-гадовая мінчанка, маці дваіх дзяцей, якая была звязана з хімічнай вытворчасцю. Дзве астатнія наркатычныя лабараторыі знойдзены ў Мінску і Мінскім раёне, дзе на дачы выраблялі амфетамін. Групоўка дзейнічала ў Беларусі на працягу 2009—2011 гадоў.

— Арганізатараў гэтай групы мы затрымалі 17 сакавіка. І ў выніку намі сумесна з упраўленнем КДБ па Мінску і Мінскай вобласці скончана сур'ёзная распрацоўка нарказлачыннай групы, — кажа **начальнік упраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама Канстанцін ЛЯШКЕВІЧ**. — У гісторыі сучаснай Беларусі такой буйной партыі не затрымлівалася ні разу. Прычым мы размаўлялі з расійскімі калегамі, яны казалі, што аднамомантава такой буйной партыі таксама не знаходзілі. У прынцыпе, тое, што існуюць такія лабараторыі, мы пачалі разумець дзесьці ў сярэдзіне 2009 года. Досыць доўга мы вялі распрацоўку гэтых груп. І ў рэшце рэшт іх затрымалі. Чаму не спяшаліся? Таму што хацелі выйсці на арганізатараў. Менавіта таму актыўныя мерапрыемствы па затрыманні пайшлі са студзеня бягучага года. Па шчырасці, нават для мяне, чалавека, які даўно працуе ў гэтай сферы, было здзіўленнем бачыць арганізатарам жанчыну з дваімі дзецьмі. Праўда, яна кажа, што проста перадавала рэчывы і г.д. Я спытаў у яе: «Няўжо вы не задумваліся, што праз пэўны час гэтыя наркотыкі могуць прыйсці да вашых дзяцей?» Яна нічога не адказала. У мяне на гэтую сітуацыю проста не было слоў. Гэта не 100 грамаў, а кілаграмы, цэлая вытворчасць...

Усяго затрымана сем чалавек. Заведзена крымінальная справа па арт. 328 ч 3 КК Беларусі, згодна з якім ім пагражае тэрмін да 8 да 13 гадоў пазбаўлення волі. Аднак можа быць прыменена і частка 4 — як да арганізаванай злачыннай групы. Па ёй да 15 гадоў пазбаўлення волі.

— Ёсць асобы, якія пайшлі на супрацоўніцтва са следствам. Магчыма, яны атрымаюць мінімальныя тэрміны пакарання, — кажа Канстанцін Ляшкевіч. — Магчыма, могуць і ўвогуле быць вызваленыя ад крымінальнай адказнасці. Калі такое атрымаецца, то мы створым такі прэцэдэнт.

Метадон — гэта сінтэтычны прэпарат, мацнейшы за гераін. Праўда, затрыманы наркотык — не той, што ўжываецца для лячэння наркаманаў. Апошні, у адрозненне ад партыі затрыманага рэчыва, не выклікае эйфарыю.

**Настасся ЗАНЬКО.**

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 20 апреля 2011 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества ОАО «ТД «Белресурсы» (продавец):

| Номер лота | № 1 | | |
|---|---|---|---|
| | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| Наименование продаваемого имущества | Административное здание, площадь 60 кв. м | 710/С-57358 | 11871 |
| | Производственно-заготовительный участок сбора вторичных ресурсов, площадь 365,6 кв. м | 710/С-57359 | 11876 |
| | Склад, площадь 287,9 кв. м | 710/С-57360 | 11877 |
| | Зеленые насаждения | | 12006 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 741000000010003390, площадь 0,4727 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Ковзана, Б.И., 5/294 | | |
| Начальная цена | 320 533 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 30 000 000 белорусских рублей | | |
| Номер лота | № 2 | | |
| | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| Наименование продаваемого имущества | Мастерская, площадь 1337, 0 кв. м | 410/С-19277 | 11607 |
| | Водопровод | | 11611 |
| | Электрокабель | | 11806 |
| | Мощение | | 11609 |
| | Ограждение. Ворота. Калитка | | 11610 |
| | Административное здание, площадь 125,9 кв. м | 410/С-20625 | 11608 |
| | Объекты озеленения | | 11800 |
| | Объекты озеленения | | 11801 |
| | Объекты озеленения | | 11802 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 420850100001006261, площадь 1,9309 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Волковысский район, г. Волковыск, ул. Жолудева, д. 76 | | |
| Начальная цена | 662 620 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 60 000 000 белорусских рублей | | |
| Номер лота | № 3 | | |
| | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| Наименование продаваемого имущества | Сторожка, площадь 16,9 кв. м | 451/С-11478 | 11998 |
| | Склад тары, площадь 842,1 кв.м | 451/С-3331 | 11645 |
| | Мастерская | | 12011 |
| | Склад | | 12012 |
| | Навес | | 12013 |
| | Склад с мастерской, площадь 228,4 кв. м | 451/С-3332 | 11646 |
| | Пристройка | | 12014 |
| | Мастерская. Гараж | | 12015 |
| | Контора с котельной, площадь 138,6 кв. м | 451/С-3333 | 11651 |
| | Забор площадью 710 кв. м | | 11999 |
| | Металлические ворота | | 12000 |
| | Зеленые насаждения | | 11809 |
| | Зеленые насаждения | | 11810 |
| | Электрическая сеть | | 11808 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 422356300002000209, площадь 1,0927 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Дятловский район, г.п. Новоельня, ул. Железнодорожная, д. 7а | | |
| Начальная цена | 93 490 000 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 9 000 000 белорусских рублей | | |
| Сведения об обременениях | Договор аренды от 01.04.2010 (арендуемая площадь 42,9 кв.м) | | |
| Номер лота | № 4 | | |
| | | Инв. № (кадастр.) | Инв. № (бухг.) |
| Наименование продаваемого имущества | Трансформатор силовой ТМ-100/10 кВт | | 11723 |
| | Бункер | | 11641 |
| | Электрошкаф | | 11625 |
| | Одноэтажное кирпичное здание склада хранения тары, площадь 799,5 кв. м | 412/С-12605 | 11618 |
| | Котельная | | 11614 |
| | Дымовая труба | | 11991 |
| | Трансформаторная подстанция | 412/С-12606 | 11617 |
| | Воздушная линия | | 11990 |
| | Кабельная линия | | 11996 |
| | Кабельная линия | | 11997 |
| | Кабельная линия | | 11989 |
| | Одноэтажное кирпичное здание цеха, площадь 446,5 кв. м | 412/С-12607 | 11615 |
| | уборная | | 11988 |
| | Сарай | | 12017 |
| | Сарай | | 11993 |
| | Сарай | | 11994 |
| | Сарай | | 11995 |
| | Пристройка | | 12016 |
| | Навес | | 11987 |
| | Котельная с дымовой трубой | | 11992 |
| | Водопровод | | 11623 |
| | Забор | | 11982 |
| | Забор | | 11983 |
| | Забор | | 11986 |
| | Забор | | 11622 |
| | Ворота | | 11984 |
| | Ворота | | 11985 |
| | Мощение | | 11621 |
| | Одноэтажное дощатое административное здание, площадь 102 кв. м | 412/С-12608 | 11620 |
| | Объекты озеленения | | 11803 |
| | Объекты озеленения | | 11804 |
| | Объекты озеленения | | 11805 |
| | Объекты озеленения | | 11807 |
| Сведения о земельном участке | Кадастровый номер 424050100012000004, площадь 0,5700 га; кадастровый номер 424050100013000004, площадь 0,7100 га | | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Гродненская область, Мостовский район, г. Мосты, ул. Занеманская, д. 54 | | |
| Начальная цена | 445 329 500 белорусских рублей без учета НДС | | |
| Сумма задатка | 40 000 000 белорусских рублей | | |
| Сведения об обременениях | Договор аренды от 01.04.2009 (арендуемая площадь 12,3 кв. м); договор аренды от 20.02.2009 (арендуемая площадь 305,6 кв. м, 21,0 кв. м); договор аренды от 01.04.2006 (арендуемая площадь 189 кв. м) | | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012037450010, в филиале ОАО «БПС-Банк» по г. Минску, код 153001334, УНП 190398583.

Заявитель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Аукцион состоится **20 апреля 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 21.03.2011 по 18.04.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости» (ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск);**

**(017) 278 35 35, ОАО «ТД «Белресурсы» (ул. Казинца, 2, 220099, г. Минск).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона с условием по продаже объектов, принадлежащих на праве собственности Брестскому районному потребительскому обществу

**Лот № 1:** здание бани, расположенное по адресу: Брестский р-н, Катин Бор. Общая площадь здания – 87,1 м.кв.

Начальная цена – 30 000 000 белорусских рублей, без НДС.

**Лот № 2:** здание грибоварни, расположенное по адресу: Брестский р-н, Катин Бор. Общая площадь здания – 29,6 м.кв.

Начальная цена – 8 000 000 белорусских рублей, без НДС.

Размер задатка для участия в аукционе – 10 % от начальной цены объекта.

Оба объекта продаются с условием организации в них центра белорусской культуры (занятие народным промыслом).

Прием заявлений заканчивается 19 апреля 2011г. до 17.00 часов.

**Аукцион состоится 20.04.2011г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Нефтяная, 10.**

Организатор аукциона – Брестское районное потребительское общество.

Контактные телефоны: 8 (0162) 23 16 23; 8 (029) 722 48 06.

УНП 200224506

## УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 31 марта 2011 г. проводит открытый аукцион № 04-А-11 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске

**Вид аукциона:** открытый (на повышение цены продажи).
**Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.
На торги выставляется право аренды на 5 лет 3 земельных участков для строительства в г. Минске:

| № п/п | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Функциональное назначение предполагаемого объекта строительства | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб. | Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | микрорайон Лошица-3, по генплану № 15 | 500000000003003909 | 0,1802 | кафе с магазином кулинария | 135 539 336 | 13 000 000 | 4 512 025 | – |
| 2 | ул. Карвата в районе КПП | 500000000001005326 | 0,1000 | кафе | 74 588 724 | 7 000 000 | 4 341 284 | – |
| 3 | ул. Кижеватова (ПДП поз.17.1) | 500000000004004465 | 0,2000 | объект общественного питания | 149 177 448 | 14 000 000 | 4 356 428 | – |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **31 марта 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (не позднее 25.03.2011 г.)** в размере, указанном в графе 7 (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – в размере, установленном для предмета аукциона с наибольшей начальной ценой), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – Финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

**представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в установленном размере (без НДС);

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым участник аукциона, которому по результатам аукциона в установленном порядке предоставляется земельный участок, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения.

**дополнительно представляется:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 21 марта 2011 г. по 25 марта 2011 г. по рабочим дням в рабочее время.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победители торгов (участники аукциона, которым земельные участки предоставляются как единственным, подавшим заявление на участие в аукционе) в течение 10 рабочих дней со дня принятия Минским горисполкомом решений о предоставлении им соответствующих земельных участков обязаны:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);
- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком заключает с победителем аукциона (в установленных законодательством случаях – с его участником) договор аренды земельного участка сроком на 5 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком может предоставить победителю аукциона рассрочку по внесению платы за предмет аукциона в установленном порядке.

После истечения срока аренды земельного участка (5 лет), предоставленного по результатам аукциона, лицо, которому он предоставлен, в установленном порядке обращается в адрес Минского горисполкома с заявлением о продлении срока аренды соответствующего участка (заключении нового договора аренды), на основании которого по решению исполкома ему предоставляется земельный участок на указанный в заявлении срок, но не более чем на 99 лет, при условии внесения этим лицом платы за право аренды земельного участка, рассчитанной на основании его кадастровой стоимости с применением коэффициентов, установленных Советом Министров Республики Беларусь исходя из сроков аренды земельных участков.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории).

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by.**

## АСАБЛІВА НЕБЯСПЕЧНАГА ЗЛАЧЫНЦУ ЗАТРЫМАЛІ Ў БАБРУЙСКУ

**Грамадзянін Арменіі, які абвінавачваецца праваахоўнымі органамі сваёй краіны ва ўчыненні двайнога забойства, затрыманы ў нашай краіне.**

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС, звесткі пра тое, што гэты мужчына падазраецца ва ўчыненні жорсткага злачынства, паступілі беларускім праваахоўнікам у лютым па каналах інтэрпала. Як мяркуецца, яшчэ ў кастрычніку 1996 года зламыснік расправіўся з адной са сваіх ахвяр у яе доме гаечным ключом. Там жа ён разам з саўдзельнікам аналагічным чынам забіў 89-гадовую старую. На цяжкае злачынства нелюдзі пайшлі, каб завалодаць грашыма, якія жанчыны напярэдадні атрымалі ад сваякоў для куплі кватэры.

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Бабруйска ўстанавілі, што падазроны нелегальна знаходзіцца на тэрыторыі нашай краіны і працуе на розных будоўлях без заключэння працоўных дагавораў. Злачынцу арыштавалі, вырашаецца пытанне аб яго экстрадыцыі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## «ЗАБАЎЛЯЛІСЯ» ДЗЕЦІ З ВІНТОЎКАЙ...

**У Салігорскую бальніцу з адкрытай чэрапна-мазгавой траўмай з пашкоджаннем галаўнога мозга шпіталізаваны вучань чацвёртага класа: хлопчыка параніў іншы школьнік.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінаблвыканкама, а палове шостай вечара ў міліцыю ад грамадзян паступілі звесткі, што на вуліцы Васкрасенскай здарылася бяда: з пнеўматычнай вінтоўкі траўміраваны школьнік. Як высветлілася, пацярпелага, вучня чацвёртага класа, траўміраваў іншы хлопчык, таксама вучань чацвёртага класа. Па гэтым факце цяпер праводзіцца праверка.

**Ігар ГРЫШЫН.**

Ну і ну!

## РАСПРАЦАВАЎ ТЭОРЫЮ... БЯСПРОЙГРЫШНАЙ ГУЛЬНІ

**Як расказаў «Звяздзе» памочнік пракурора Першамайскага раёна Віцебска Сяргей Будрэвіч, гэтая гісторыя пачалася яшчэ некалькі гадоў таму, калі ў абвінавачанага ўзнік інтарэс да картачных гульняў. Пасля гэтага ў яго з'явілася і адпаведная залежнасць — так званая «гульняманія».**

Сяргей Пятроў (імя і прозвішча зменены) пачаў дэталёва вывучаць тэорыю верагоднасці, віды картачных гульняў. І гэтым спрабаваў зарабіць. Не атрымлівалася. За некалькі гадоў у выніку прыйшлося прадаць некалькі кватэр. Але ж да гульняў цягнула ўсё больш.

У выніку Сяргей распрацаваў сваю аўтарскую тэорыю бяспройгрышнай гульні. Каб «падтрымаць» яе (напэўна, праверыць у дзейнасці), спатрэбіліся ажно каля дваццаці тысяч долараў. Не маючы і тысячы «зялёных», вырашыў «тэарэтык» звярнуцца па дапамогу да старых знаёмых, з якімі раней працаваў.

Праўда расказваў ім не пра сваю тэорыю, а што хоча развіваць бізнэс па продажы канцылярскіх тавараў. У выніку атрымаў ад трох знаёмых больш за 56 мільёнаў рублёў.

Ад тэорыі Сяргей перайшоў да практыкі: гуляў, рабіў стаўкі ў чаканні буйнога выйгрышу. Амаль што ўсе пазычаныя грошы прайграў. Падманутыя знаёмыя, якім грошы не вярнуў, звярнуліся па дапамогу ў міліцыю.

За свае дзеянні «тэарэтык» асуджаны на чатыры гады пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Да ведама

# ФУРУНКУЛЫ НЕ ВЫЦІСКАЦЬ!

**З'ЯЎЛЕННЕ гнайнічкоў на скуры — з'ява частая, і звычайна чалавек не надае ім асаблівага значэння. Але бывае, што бяскрыўдны на выгляд прышчык раптам ператвараецца ў вялізны фурункул (у народзе ён называецца скула). А гэта ўжо праблема сур'ёзная.**

### У чым прычына?

Галоўная роля ва ўтварэнні гнайнікоў належыць гнаяродным бактэрыям, у асноўным залацістым стафілакокам. Гэта сапраўдныя скурныя «вампіры». Каб пачаць атаку, яму дастаткова маленькай брэшы ў імуннай сістэме і мікратрэшчыны на скуры. Калі ў чалавека павышана адчувальнасць да гэтага мікроба або маецца імунадэфіцыт, фурункулёз становіцца хранічным.

Фурункулы часцей узнікаюць на фоне адчувальнай, схільнай да раздражнення скуры. Шанц ім даюць цяжкія або хранічныя хваробы, хірургічныя ўмяшанні, гарманальныя перабудовы і ўвогуле ўсё, што аслабляе арганізм, — авітаміноз, інтаксікацыя, няправільнае харчаванне. Акрамя таго, для любога чалавека «фурункуланебяспечнае» спалучэнне поту і гразі. У гэтым выпадку арганізм проста не можа ўстаяць перад інфекцыяй.

### Як утвараецца фурункул?

Адметная асаблівасць фурункулаў ад іншых відаў запалення скуры ў тым, што яны не могуць узнікаць там, дзе не растуць валасы (далоні, падэшвы), а з'яўляюцца толькі ў тых месцах, дзе знаходзяцца валасяныя фалікулы.

Калі ў мікроба з'яўляецца магчымасць пранікнуць пад скуру праз драпіну або мікратрэшчыну, ён «прыладжваецца» ўнутры валасяной цыбуліны і пачынае актыўна размнажацца. Месца яго ўкаранення чырванее, пачынае часацца і моцна балець. Болі непакояць увесь час, пакуль ідзе «высpяванне» гнайніка. Часта на запаленне рэагуюць размешчаныя побач лімфатычныя вузлы. Праз некалькі дзён гной выходзіць, і ранка хутка загойваецца. Але кожны фурункул «параджае» на сябе падобных. Пры яго раскрыцці разам з гноем на скуру «высаджваюцца» тысячы новых узбуджальнікаў. Так адбываецца да таго часу, пакуль арганізм не знойдзе ў сябе сілы спыніць агрэсара.

**Увага! Пры паўторным з'яўленні фурункулаў варта абавязкова звярнуцца да доктара і праверыць узровень цукру ў крыві, паколькі гэта нярэдка з'яўляецца сімптомам дыябету.**

### Як лячыць?

Калі фурункул парушае агульнае самаадчуванне, напрыклад, непакоіць моцны боль або павышаецца тэмпература, зварот да доктара абавязковы! Толькі ўрач, з улікам распаўсюджання запалення, можа прызначыць лячэнне. Калі вы звярнуліся на самай ранняй стадыі развіцця, калі запаленчы працэс яшчэ не выйшаў за межы валасянога мяшочка, то магчымае кансерватыўнае лячэнне без раскрыцця. Калі гнайнік ужо сфарміраваўся — толькі аператыўнае лячэнне.

Нельга пакідаць без урачэбнай дапамогі фурункулы, размешчаныя на твары і шыі! Крывяносныя сасуды гэтых абласцей «кантактуюць» з сасудамі галаўнога мозга і могуць занесці інфекцыю ў мазгавую абалонку, выклікаць гнойны менінгіт, сепсіс. Ні ў якім выпадку нельга спрабаваць выціскаць гнайнік, пратыкаць яго іголкай або раскрываць іншымі спосабамі ў «палявых» умовах!

Улічваючы, што ўзбуджальнікам гэтага захворвання з'яўляецца стафілакок, для лячэння прызначаюцца антыбіётыкі. Паказана сухое цяпло, а таксама УВЧ, што аказвае болесуцішальны эфект. Таксама ўрач падбярэ вітамінны комплекс для ўмацавання імунітэту. Перавага аддаецца прэпаратам з высокім утрыманнем вітамінаў групы B, дэфіцыт якіх і дае «карт-бланш» залацістаму стафілакоку.

У хатніх умовах гнайнічок, які толькі з'явіўся на скуры, можна паспрабаваць «высушыць» зялёнкай або ёдам. Можна некалькі разоў на дзень змазваць скуру антыбактэрыяльнай маззю. Яна пранікае ў глыбокія слаі скуры і здольная спыніць запаленчы працэс.

**Самы традыцыйны народны сродак для паскарэння «выспявання» фурункула — печаная цыбуліна.** Вялікую цыбуліну трэба разрэзаць папалам і запячы да чарнаты. Добра цёплай прыкласці да фурункула і прыбінтаваць, пакінуць на ноч. Да раніцы ўсё змесціва фурункула акажацца на павязцы.

Гаючыя ўласцівасці цыбулі такія моцныя, што для лячэння гнайніка падыдзе нават яе шалупінне. Яго трэба адварыць і перамяшаць з лісцем трыпутніку з разліку 1:1, дадаць мукі і мёду, каб атрымалася густое цеста. Аладку пакласці на фурункул і зафіксаваць павязкай. Калі гнайнік праз пару дзён прарве, праціраць скуру вакол яго настойкай календулы. Замест трыпутніку падыдуць лісце крапівы або кашка са свежых каранёў пятрушкі.

**Увага! Антыбактэрыяльным мылам можна карыстацца не больш як два тыдні. Забіваючы карысныя бактэрыі, яно аслабляе паверхневую абарону скуры і можа справакаваць з'яўленне новых гнайнікоў. Лепш апрацоўваць скуру саліцылавым спіртам, настойкай календулы або эўкаліпту, а для купання выкарыстоўваць адвар ваўчкоў, рамонку, падбелу або іх збор (2 шклянкі травы заліць літрам кіпеню, настойваць 40 хвілін, працадзіць і выліць у ванну).**

Хворым на фурункулёз неабходна прытрымлівацца пэўнай дыеты: абмежаваць колькасць вугляводаў у рацыёне, выключыць спіртныя напоі, вострыя прыправы, ласункі. «Зялёныя» вітаміны, хлеб з мукі грубага памолу, кашы з цэльнага зерня, кісламалочныя прадукты і неачышчаныя алеі пераходзяць пры фурункулёзе з разраду харчовых прадуктаў у статус лекавых сродкаў.

Для ўмацавання імунітэту карысны адвар шыпшыны. Ягады лепш збіраць, калі яны яшчэ аранжавыя. У гэты час у іх максімум карысных рэчываў. Для прыгатавання адвару 150 г ягад трэба заліць раніцай літрам крутога кіпеню, паварыць на слабым агні 10 хвілін і даць пастаяць суткі. Затым зліць палову адвару і прымаць яго па паўшклянкі 3 разы на дзень, дадаўшы 1 ч. лыжку мёду. У тое, што засталося, даліць палову колькасці кіпеню і настойваць яшчэ суткі. Затым адкінуць ягады на друшляк і высушыць. Калі назбіраецца каля кілаграма «сухафруктаў», трэба заліць іх алеем і патрымаць у каструлі на маленькім агні каля дзвюх гадзін. «Хатнім» алеем шыпшыны можна змазваць парэзы і апёкі, апрацоўваць «праблемную» скуру і нават дабаўляць яго ў салаты і кашы.

Паспрабуйце прыгатаваць яблычна-мядовы сіроп. Тры антонаўскія яблыкі заліце літрам крутога кіпеню. Настойвайце прыкладна 3 гадзіны, ухутаўшы каструлю коўдрай. Затым расцісніце яблыкі прама ў вадзе, працадзіце вадкасць праз марлю і дадайце да пюрэ 2 ст. лыжкі мёду. Ужывайце сіроп па 50 г раніцай нашча і вечарам перад сном.

**Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ НА ПРАВО ПРОЕКТИРОВАНИЯ И СТРОИТЕЛЬСТВА КАПИТАЛЬНЫХ СТРОЕНИЙ (ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ) В г. БРЕСТЕ

| Предмет аукциона | Право на заключение договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений) на земельном участке | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | лот № 1 | лот № 2 | лот № 3 | лот № 4 | лот № 5 | лот № 6 |
| | ул. Ленина, 42 площадью 0,0537 га | ул. Гоголя, 42, 42/1, 44 и 46/1 площадью 0,2950 га | ул. Комсомольская, 5, 7, 7/1 и 9 площадью 0,2416 га | территория бывшего в/г № 2 «Южный» площадью 8,8797 га | ул. К. Маркса, 95 площадью 0,0460 га | ул. 17 Сентября, 39 и 41, и ул. Советских Пограничников, площадью 0,5931 га |
| Функциональное назначение земельного участка | Строительство и обслуживание административно-офисного здания с объектами торговли и соцкультбыта на 1 этаже | Строительство жилых домов с объектами соцкультбыта на 1 этаже | Строительство жилого дома с объектами соцкультбыта на 1 этаже | Строительство многоэтажных жилых домов повышенной комфортности | Строительство и обслуживание объекта административно-торгового назначения | Строительство жилого дома с объектами соцкультбыта на 1 этаже |
| Срок аренды зем. участка | 5 лет | 5 лет | 5 лет | 5 лет | 5 лет | 5 лет |
